*С.В. Вайшнаровіч, Ю.С. Собалева*
*БГЭУ (Минск)*

# ІДЭАЛОГІЯ «ДЭМАКРАТЫЧНАГА ТАВАРЫСТВА» І ПРАБЛЕМА ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

Адным з пытанняў, якое знаходзілася ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў грамадска-палітычнага руху Беларусі першай паловы XIX ст., была праблема правоў чалавека. Сваё адлюстраванне яна знайшла ў ідэалогіі «Дэмакратычнага таварыства» — нелегальнай маладзёжнай арганізацыі, якая існавала ў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі і аб'ядноўвала ў асноўным студэнтаў — выхадцаў з Беларусі, Украіны і Польшчы. Ф. Савіч быў адным з пачынальнікаў і прадстаўнікоў, арганізатарам «дэмакратычнага таварыства» сярод студэнтаў і разначыннай моладзі. Удзельнікі маладзёжнага аб'яднання лічылі неабходным прадставіць правы чалавека ўсім людзям незалежна ад іх сацыяльнай прыналежнасці.

Ідэалогія «дэмакратычнага грамадства» актуальная на дадзеным этапе развіцця Беларускага грамадства, так як яна адлюстроўвае тэндэнцыі працэсу фарміравання беларускай нацыі і нацыянальнай культуры.

У дачыненні да механізмаў рэалізацыі такіх прынцыпаў, як сацыяльная роўнасць, вызваленне сялян з зямлёй ад прыгоннай залежнасці, права кожнага народа на нацыянальную самастойнасць поглядаў удзельнікаў «дэмакратычнага таварыства» разыходзіліся. Адны выступалі за «лютую помсту памешчыкам: усіх павесіць, усіх выразаць». Іншыя лічылі неабходнай умовай усталявання роўнасці існавання прававой дзяржавы, калі ўсе будуць падпарадкоўвацца толькі «аднаму закону».

Маладзёжнае аб'яднанне надавала вялікае значэнне праву на атрыманне адукацыі, з рэалізацыяй якога звязвалася магчымасць паступовага ўдасканалення грамадскіх адносін у дачыненні да забяспечвання правоў чалавека. Некаторыя ўдзельнікі таварыства лічылі, што перад тым, як прадставіць простаму народу палітычныя правы, неабходна абавязковая праца па яго асвеце.

Сярод палітычных правоў найбольшая увага надавалася праву ўдзельнічаць ў кіраванні дзяржавай, у першую чаргу праз выбарны прадстаўнічы орган. Па пытанню аб ўдзеле тых ці іншых слаёў у кіраванні дзяржавай у межах аб'яднання існавалі пэўныя разыходжанні. Адны лічылі неабходным сканцэнтраваць кіраванне дзяржавай у руках простага народа. Іншыя меркавалі, што ў будучы прадстаўнічы орган павінны былі ўвайсці прадстаўнікі ад усіх саслоўяў.

Далейшая канкрэтызацыя ўяўленняў удзельнікаў таварыства ў адносінах да праблемы правоў чалавека адбываецца ў сувязі з яго ўваходжаннем у склад «Садружнасці польскага народа» (1835—1838) і прыняццем вясной 1838 г. яе праграмы. У дакуменце дэкларавалася неабходнасць увядзення свабоды друку, свабоды сумлення, права на асацыяцыі, права на адукацыю, свабоды гандлю і прадпрымальніцтва, пра-



Электронная библиотека БГЭУ

дугледжвалася ўвядзенне ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права ў агульнадзяржаўны аднапалатны заканадаўчы орган, а таксама элементаў непасрэднай дэмакратыі.

Такім чынам, погляды ўдзельнікаў «Дэмакратычнага таварыства» на правы чалавека былі заснаваны на еўрапейскай філасофска-прававой традыцыі, якая сцвердзіла іх натуральны, універсальны характар і зыходзіла з разумення неабходнасці глыбокіх грамадскіх змен, накіраваных на стварэнне ўмоў для рэалізацыі творчага патэнцыялу асобы. Разам з тым варта адзначыць, што маладзёжнае аб'яднанне імкнулася не толькі засвоіць еўрапейскія каштоўнасці у сферы правоў чалавека, але і развіць іх на падставе асэнсавання тагачасных беларускіх рэалій.

***В.А. Валадковіч***
*БДУ (Мінск)*

# ЭВАЛЮЦЫЯ РОЛІ ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ Ў СУДОВАЙ СІСТЭМЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XV—XVI стст.

У Вялікім княстве Літоўскім (далей — ВКЛ) вялікі князь з'яўляўся галоўным суб'ектам прававой сістэмы, носьбітам заканадаўчай, судовай і выканаўчай улады. Аднак даследчыкі робяць асноўны акцэнт на адлюстраванне ролі вялікага князя ў заканадаўчай, ваеннай, фінансавай сферах, у той час як яго месца ў судовай сістэме ў асноўным застаецца па-за ўвагай. Між тым вялікі князь прадстаўляў вышэйшую судовую ўладу, аб'ём і кампетэнцыя якой на працягу XV—XVI стст. значна змяняліся.

Да сярэдзіны XV ст. вялікаму князю належыў «зверхній вряд», «вышшое право». Вялікі князь лічыў ажыццяўленне судаводства важнейшым сваім абавязкам, а таксама значным сродкам падтрымання ўлады і ўплыву. Часцей за ўсё на судзе прысутнічалі паны-рады, але іх удзел не быў абавязковым, і вырашальнае слова належыла вялікаму князю. Кампетэнцыя яго суда не была вызначана законам і з'яўлялася даволі шырокай. Перш за ўсё вялікі князь разглядаў найбольш значныя пытанні: справы аб нагаворы і гонару; скаргі на службоўцаў; справы, звязаныя з пакараннем, пазбаўленнем шляхецтва, здрада, справы аб тытулах і правах; зямельныя і маёмасныя справы, спадчынныя спрэчкі, крымінальныя справы (наезды, ваенныя злачынствы, забойствы); абраза вялікага князя; справы аб злачынствах супраць паноў-рады, ваявод, кашталянаў, стараст, суддзяў. Звяртацца ў вялікакняжацкі суд маглі амаль усе свабодныя людзі.

З сярэдзіны XV ст. адбываецца працэс абмежавання ўлады вялікага князя, у тым ліку і судовай, на карысць Рады. Згодна Судзебніку 1468 г., вялікі князь перадае свае судовыя функцыі ў час адсутнасці ў ВКЛ панам-рады. Прывілей 1492 г. заканадаўча замацоўвае іх ролю не



Электронная библиотека БГЭУ
БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by